приводили из своей личной жизни. Совместными усилиями старались помочь разрешить возникающие конфликты между детьми и взрослыми. На факультативных занятиях ребята были не замкнуты, активно участвовали в обсуждении вопросов.

Ну и, конечно же, самыми интересными оказались педагогические пробы, где учащиеся почувствовали себя в роли учителя. Было приятно наблюдать, как ребята общаются с младшими школьниками, как умело выходят из трудных ситуаций без участия учителя. Учащиеся этого факультативного курса проходили педагогические пробы в 5 «Б» классе по предмету «Основы безопасности жизнедеятельности». После первого занятия было заметно, что старшеклассники устали. Они стали понимать, какой тяжёлый труд учителя.

Не менее интересной и полезной для ребят была работа со второклассниками по подготовке к приёму в октябрята. Учащиеся факультативных занятий посещали второклассников и учили вместе с ними правила октябрят, отрабатывали навыки правильного поведения во время октябрятских сборов.

Учащиеся начальных классов всегда с нетерпением ждали старшеклассников. Им очень нравилось выполнять разнообразные задания, рисовать, разгадывать загадки и кроссворды. Оставалось немного времени и на подвижные игры.

Таким образом, данные факультативные занятия очень полезны и актуальны для учащихся классов II ступени. Они позволяют на раннем этапе выявить учащихся, которым нравится профессия «учитель» и развить те компетенции, которые необходимы для успешной профессиональной педагогической деятельности в будущем.

УДК 371.321.3

# ЭФЕКТЫЎНЫЯ ПРЫЁМЫ І ФОРМЫ ПРАФАРЫЕНТАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ З НАВУЧЭНЦАМІ З ВЫКАРЫСТАННЕМ КАБІНЕТА ПРАФАРЫЕНТАЦЫІ

***В.І. Буйвіч***
*ГУО «Жамчужненская сярэдняя школа Баранавіцкага раёна»,*
*Рэспубліка Беларусь*
*nika-19952074462@mail.ru*

*Анатацыя.* У артыкуле разглядаюцца прыёмы і формы прафарыентацыйнай работы ў школе, накіраваныя на аказанне прафарыентацыйнай падтрымкі навучэнцам у працэсе выбару профіля навучання і сферы будучай прафесійнай дзейнасці, а таксама на выпрацоўку ў школьнікаў свядомага стаўлення да працы, прафесійнага самавызначэння ва ўмовах свабоды выбару сферы дзейнасці ў адпаведнасці са сваімі магчымасцямі, здольнасцямі і з улікам патрабаванняў рынку працы.

*Ключавыя словы:* прафесійнае самавызначэнне, самаацэнка, прафесійная цікавасць, прафесійныя схільнасці, прафесійны план, прафесійная прыдатнасць, прафесійная кар'ера, прафесійная проба.

**EFFECTIVE METHODS AND FORMS OF CAREER GUIDANCE ACTIVITIES WITH STUDENTS USING THE CAREER GUIDANCE CABINET**

***V.I. Buivich***
*State Educational Institution*
*«Secondary School of Zhemchuzhny*
*of Baranovichi district»,*
*Republic of Belarus*
*nika-19952074462@mail.ru*

*Abstract.* The article discusses the methods and forms of career guidance work at school aimed at providing career guidance support to students in the process of choosing the studying profile and the sphere of their future professional activity, as well as at developing a conscious attitude to work, professional self-determination in the conditions of free choice of the field of activity in accordance with their capabilities, abilities and considering the requirements of the labor market.

*Key words:* professional self-determination, self-assessment, professional interest, professional inclinations, professional plan, professional suitability, professional career, professional test.

Для забеспячэння незалежнага і прадуктыўнага жыцця ў соцыуме чалавека неабходна ўключаць у мэтанакіраваны працэс сацыялізацыі, адным з найважнейшых інстытутаў якога з'яўляецца сістэма прафесійнай адукацыі. Прафесійная арыентацыя падлетка вырашае адну з найважнейшых задач сацыялізацыі асобы – задачу яго прафесійнага самавызначэння.

Прафарыентацыйная работа – гэта практычныя мерапрыемствы рэкамендацыйнага характару па выбары будучай прафесійнай дзейнасці на аснове інфармацыі аб прафесіі, працоўным месцы, прагнозе паспяховасці ў дадзенай дзейнасці.

Асноўныя задачы прафарыентацыйнай работы:

– пошук найбольш эфектыўных формаў і метадаў прафарыентацыйнай работы, умоў яе ўдасканалення;

– укараненне інфармацыйных тэхналогій у арганізацыю прафарыентацыйнай работы;

– развіццё імкнення да свядомага выбару прафесіі, якая адпавядае здольнасцям і інтарэсам вучняў.

Ва ўмовах рыначнай эканомікі прафарыентацыйная работа ў школе носіць не дапаможны характар, а накіравана на вырашэнне праблем, звязаных з працаўладкаваннем выпускнікоў [5, с. 27].

Сучасны падыход да прафарыентацыі мае на ўвазе ўзгодненую работу многіх сацыяльных інстытутаў: школа, розныя псіхалагічныя цэнтры (медыка-сацыяльна-псіхалагічныя, цэнтры занятасці, цэнтры прафарыентацыі моладзі і інш.), клубы, дамы тэхнічнай творчасці, прафесійныя навучальныя ўстановы, грамадскія арганізацыі, праваахоўныя органы (якія працуюць з моладдзю), сродкі масавай інфармацыі і г.д.

Улічваючы вялікую ўключанасць розных арганізацый, неабходна каардынацыя гэтай работы. Сёння ў якасці такога каардынатара часцей за ўсё выступае школа, а ў ёй – педагогі-псіхолагі, педагогі сацыяльныя, класныя кіраўнікі.

Мэтай прафарыентацыйнай работы ў школе з'яўляецца аказанне прафарыентацыйнай падтрымкі навучэнцам у працэсе выбару профіля навучання і сферы будучай прафесійнай дзейнасці, а таксама выпрацоўка ў школьнікаў свядомага стаўлення да працы, прафесійнага самавызначэння ва ўмовах свабоды выбару сферы дзейнасці ў адпаведнасці са сваімі магчымасцямі, здольнасцямі і з улікам патрабаванняў рынку працы.

Да задач прафарыентацыі адносіцца атрыманне дадзеных аб перавагах, схільнасцях і магчымасцях навучэнцаў для падзелу іх па профілях навучання; забяспечанне шырокага дыяпазону варыятыўнасці профільнага навучання за кошт комплексных і нетрадыцыйных формаў і метадаў, якія выкарыстоўваюцца на ўроках, у выхаваўчай рабоце; дадатковая падтрымка некаторых груп школьнікаў, у якіх лёгка спрагназаваць складанасці працаўладкавання – навучэнцаў карэкцыйных класаў і інш.; выпрацоўка гнуткай сістэмы кааперацыі старэйшай ступені школы з установамі дадатковай і прафесійнай адукацыі, а таксама з прадпрыемствамі раёна, рэгіёна [3, с. 59].

Прынцып свядомасці ў выбары прафесіі выяўляецца ў імкненні задаволіць сваім выбарам не толькі асобныя патрэбы ў працоўнай дзейнасці, але і прынесці як мага больш карысці грамадству.

Прынцып адпаведнасці абранай прафесіі інтарэсам, схільнасцям, здольнасцям асобы і адначасова патрэбам грамадства ў кадрах пэўнай прафесіі выказвае сувязь асобаснага і грамадскага аспектаў выбару прафесіі.

Прынцып актыўнасці ў выбары прафесіі характарызуе тып дзейнасці асобы ў працэсе прафесійнага самавызначэння. Прафесію трэба актыўна шукаць самому. У гэтым вялікую ролю адыгрывае: практычная проба сіл саміх навучэнцаў у працэсе працоўнай і прафесійнай падрыхтоўкі, парады бацькоў і іх прафесійны вопыт, пошук і чытанне літаратуры, праца падчас практыкі і многае іншае[2, с. 27]. У рамках інавацыйнага праекта вучні педагагічных классаў нашай школы маёць магчымаць “адчуць” сябе педагогам. Пад кіраўніцтвам настаўніка-прадметніка яны прымаюць ўдзел у дэкадах педагагічных проб. Вучні рыхтуюць урок ці элемент урока і даюць яго ў класе. Такі практычны вопыт і з’уляецца першай прыступкай для далейшага прафесійнага самавызначэння.

Псіхафізіялагічныя асаблівасці да пачатку працоўнай дзейнасці яшчэ не сведчаць адназначна аб прыдатнасці чалавека, галоўнае залежыць ад асобы,

ад жадання працаваць у гэтай сферы. Цэнтральную ўвагу трэба надаць аналізу тыпу асобы, а не толькі асобных яе якасцей. Прафесію пажадана падбіраць не да асобных прафесій на важных якасцях чалавека, а да цэласнай асобы. З іншага боку, мэтазгодна арыентаваць асобу не на вузкую прафесію, а на досыць шырокі спектр спецыяльнасцей унутры прафесіі (напрыклад, настаўнік-прадметнік, метадыст, кіраўнік, школьны псіхолаг), што палягчае ўзаемазамяняльнасць спецыялістаў, іх магчымую перакваліфікацыю. У рамках інавацыйнага праекта вучні педагагічных классаў маюць магчымаць цесна ўзаемадзейнічаць як з настаўнікамі-прадметнікамі, так і з псіхолагамі, з педагогамі сацыяльнымі ўстановы адукацыі. Такая форма работы дапамагае засяродзіць увагу вучняў на сумежных педагагічных спецыяльнасцях, каб потым быць запатрабаванымі на рынку працы.

Гатоўнасць да выбару і да авалодання прафесіяй вызначаецца веданнем патрабаванняў прафесіі да чалавека і адэкватнай ацэнкай чалавекам неабходных прафесійна важных якасцей у сабе, паспяховым рашэннем вучэбна-прафесійных задач.

Актуальнымі формамі і метадамі фарміравання ў навучэнцаў цікавасці да прафесійнай работы з'яўляюцца факультатыўныя заняткі, работа аб'яднанняў па інтарэсах, дні адчыненых дзвярэй, экскурсіі на прадпрыемствы, арганізацыя часовай працоўнай занятасці, удзел вучняў у грамадска-карыснай працы, псіхалагічныя заняткі, трэнінгі, прафарыентацыйныя гульні, прафінфармаванне з актыўным выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій і інтэрнэт-рэсурсаў і інш.

Асноўнымі метадамі прафарыентацыйнай работы з'яўляюцца:

– урок з паведамленнем пэўных звестак прафарыентацыйнага характару, а таксама з дэманстрацыяй падчас урока або лабараторна-практычнага занятку; прафарыентацыйны ўрок мае выключнае значэнне, паколькі ўрок з'яўляецца асноўнай формай навучальна-выхаваўчага працэсу ў школе. На прафарыентацыйных уроках разглядаюць тэарэтычныя і практычныя пытанні падрыхтоўкі да выбару будучай прафесіі. На ўроках выкарыстоўваюць розныя метады: гутарка, аповяд, тлумачэнне, дыспут, самастойнае складанне прафессіяграм, справаздача аб прафарыентацыйных мерапрыемствах. У рамках інавацыйнага праекта для вучняў школы дзейнічаюць факультатыўныя заняткі, задачай якіх з’яўляецца дапамагчы навучэнцам праявіць свае здольнасці на настаўніцкай ніве праз напісанне творчых работ, удзелу ў конкурсах і г.д.

– апавяданне – яго выкарыстоўваюць для паведамлення звестак аб змесце працы прадстаўнікоў розных прафесій, аб патрабаваннях да дадзенай прафесіі, да псіхафізіялагічных якасцей асобы і інш. Актыўна прапагандуецца ў нашай школе выступленне прадстаўнікоў розных прафесій на класных гадзінах, адкрытых сустрэчах. Вучням заўсёды цікава падтрымліваць гутарку з чалавекам, які шмат год працуе па пэўнай спецыяльнасці, якімі валодае якасцямі, якіх вяршынь дасягнуў у сваёй дзейнасці.

– тлумачэнні – выкарыстоўваюць для паведамлення асаблівасцей рознага роду працоўнай дзейнасці, правіл выбару прафесіі і г.д., пры гэтым ўводзяцца новыя паняцці і тэрміны (прафесія, прафесіяграма г.д.), дэманструюцца навучальныя табліцы, схемы, дыяграмы [3, с. 120]; аповяд і тлумачэнні павінны быць дакладнымі, выразнымі і доказнымі, а выклад матэрыялу - кароткім, але эмацыянальным, лагічна пабудаваным;

– прафарыентацыйная гутарка – найбольш распаўсюджаны метад; яна павінна быць лагічна звязана з навучальным матэрыялам і падрыхтавана раней; да працэсу падрыхтоўкі прафарыентацыйнай гутаркі мэтазгодна прыцягваць саміх навучэнцаў, напрыклад, даручыць ім сабраць інфармацыю па гэтым пытанні; эмацыянальную афарбоўку гутарцы дадаюць цытаванне вядомых навукоўцаў, вынаходнікаў, пісьменнікаў, прымяненне наглядных метадаў прафарыентацыйнай працы; тэматыка прафарыентацыйных гутарак павінна адпавядаць узроставым асаблівасцям школьнікаў і ахопліваць кола пытанняў, якія цікавяць навучэнцаў;

– наглядныя метады прафарыентацыі; дэманстрацыя аб'ектаў, якія вывучаюцца, можа служыць не толькі падцверджаннем выкладзенага матэрыялу, але і крыніцай ведаў (напрыклад, назіранне за працай рабочых падчас экскурсіі). Тут магчымы некалькі відаў дэманстрацыі:

– выявы аб’ектаў (карціны, плакаты, фільмы і г.д.) – прыёмы працы пры лабараторна-практычных занятках[1, с. 49].

Адным са сродкаў рашэння самавызначэння навучэнцаў у школе з'яўляецца кабінет прафарыентацыі. Кабінет па прафарыентацыі – гэта цэнтр для арганізацыі і правядзення прафарыентацыйнай работы з настаўнікамі, навучэнцамі і бацькамі, а таксама для самастойнага азнаямлення школьнікаў з матэрыяламі аб розных прафесіях, іх патрабаваннях да якасцей асобы, індывідуальных і групавых кансультацый, правядзення факультатыўных заняткаў.

Асноўнымі напрамкамі функцыянальнай дзейнасці на базе кабінета з'яўляюцца:

– укараненне метадычных дасягненняў у галіне прафарыентацыі ў практыку работы;

– аказанне інфармацыйна-даведачных кансультацый навучэнцам, настаўнікам, бацькам;

– дапамога ў самавызначэнні і арганізацыі самападрыхтоўкі ў выбары прафесіі;

– устанаўленне ўстойлівай сувязі з вытворчасцю і арганізацыямі, Цэнтрам занятасці з мэтай сістэматычнага папаўнення зместу наглядных матэрыялаў новымі дадзенымі прафарыентацыйнага характару;

– правядзенне заняткаў па прафарыентацыйнай тэматыцы «Чалавек-праца-прафесія», «Самавызначэнне», «Мой выбар» і інш.;

– вядзенне індывідуальнай работы з вучнямі, якія маюць цяжкасці ў выбары прафесіі, альбо якія маюць супрацьпаказанні да абранага віду працоўнай дзейнасці;

– прапаганда прафесій, запатрабаваных на рынку працы, з улікам асаблівасці рэгіёну і краіны ў цэлым.

У кабінеце прафарыентацыі ДУА "Жамчужненская сярэдняя школа" Баранавіцкага раёна знаходзіцца неабходнае інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне: аформлены стэнд "Выбіраючы прафесію - выбіраеш будучыню", на якім размешчана інфармацыя аб розных навучальных установах, адукацыйных праграмах, дадзены рэкамендацыі па выбары прафесіі; сабраны папкі з метадычнымі распрацоўкамі, матэрыяламі па прафарыентацыі для выкарыстання класнымі кіраўнікамі, педагогамі сацыяльнымі, настаўнікамі-прадметнікамі: "Марафон прафесій", "Усе прафесіі неабходны, усе прафесіі патрэбны", "Шматгранны свет прафесій", "Кім быць?", "У пошуках свайго прызначэння", "Што ўплывае на выбар прафесіі", "Аўкцыён прафесій". У кабінеце ёсць матэрыялы аб рынку працы Баранавіцкага раёна, алфавітны каталог прафесій і спецыяльнасцей ВНУ Беларусі, сярэдніх спецыяльных устаноў Рэспублікі Беларусь, буклеты і брашуры ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Баранавіцкага райвыканкама. Створана відэатэка "Свет прафесій" для правядзення віртуальных экскурсій з улікам узроставых асаблівасцей навучэнцаў, прэзентацыі, гульні. Інфармацыя аб розных навучальных ўстановах, прафарыентацыйных мерапрыемствах размяшчаецца на сайце ўстановы адукацыі ДУА "Жамчужэнская сярэдняя школа" Баранавіцкага раёна (http://zhemch.baranovichi.edu.by/ru/main.aspx?guid=33771).

Важным кампанентам дзейнасці кабінета па прафесійнай арыентацыі з'яўляецца метадычная праца, да якой можна аднесці:

– наяўнасць інфармацыйна-метадычных рэсурсаў для распрацоўкі рэкамендацый з мэтай удасканалення прафарыентацыйнага напрамку дзейнасці школы па развіцці асобасных якасцей і здольнасцей навучэнцаў, якія забяспечваюць паспяховае прафесійнае самавызначэнне кожнага школьніка;

– адбор і падрыхтоўка рэкамендацый педагагічнаму калектыву школы сучасных метадаў і формаў прафарыентацыйнай работы з навучэнцамі;

– падбор варыятыўных практычных формаў работы (праграм трэнінгавых заняткаў, прафесійных спроб і інш.), якія спрыяюць арганізацыі эфектыўнай прафарыентацыйнай працы ў школе і фарміруюць свядомы прафесійны выбар навучэнцаў. У дадзеным накірунку работа загадчыка кабінета вядзецца ў цеснай сувязі з педагогам-псіхолагам школы, які мае багаты вопыт работы і вялікую колькасць напрацаваных матэрыялаў.

У рамках рэалізацыі інавацыйнага праекта "Укараненне мадэлі дапрофільнай падрыхтоўкі педагагічнай накіраванасці на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі" работа кабінета прафарыентацыі была накіравана на дапамогу вучням атрымаць карысныя веды аб асаблівасцях асобы педагога, прафесійных патрабаваннях, установах адукацыі краіны, у якіх можна атрымаць спецыяльнасць педагагічнай накіраванасці. Віртуальныя экскурсіі ў педагагічныя ўстановы дапамагаюць навучэнцам вызначыцца з выбарам прафесіі, і што вельмі важна з выбарам установы адукацыі. Выпускнікі

школы праз відэаролікі і прэзентацыі маюць магчымасць зрокава пазнаёміцца з умовамі навучання і пражывання, аб'яднаннямі па інтарэсах, якія існуюць ва ўстанове адукацыі, з асаблівасцямі працаўладкавання.

Кабінет прафарыентацыі дае магчымасць рэалізоўваць сябе ў будучай прафесіі, развіваць свае таленты і здольнасці, атрымліваць аснову для ўласнага развіцця. Вучні педагагічных класаў на базе кабінета праводзяць факультатыўныя заняткі, дзе праз творчыя формы работы рэалізуюць сваё прафесійнае самасцверджанне. У рамках інавацыйнага праекта для вучняў 5-х класаў, якія наведваюць факультатыў "Вучыся вучыцца", была арганізавана экскурсія ў кабінет з мэтай развіцця ў школьнікаў асобаснага сэнсу ў набыцці пазнавальных інтарэсаў да прафесійнай дзейнасці. Вучні 7-х класаў, займаючыся ў кабінеце прафарыентацыі, стваралі малюнкі "Калейдаскоп прафесій". Сваімі творчымі работамі школьнікі ўнеслі ў кабінет атмасферу жыццесцвярджальнасці і арыгінальнасці пры падыходзе да прафесійнага самавызначэння. Частымі наведвальнікамі кабінета з'яўляюцца вучні 9-х класаў. Выпускнікі знаёмяцца з буклетамі, якія знаходзяцца ў кабінеце, друкаванымі матэрыяламі, нумарамі часопіса "Кім быць?". Кабінет прафарыентацыі ўстановы адукацыі стварае ўсе магчымасці для правільнага, абдуманага выбару прафесіі.

Прафесійнае самавызначэнне чалавека пачынаецца яшчэ ў дзяцінстве, калі ў дзіцячай гульні дзіця прымае на сябе розныя прафесійныя ролі і праігрывае звязаныя з ім паводзіны. Заканчваецца яно ў раннім юнацтве, калі ўжо неабходна прыняць рашэнне, якое паўплывае на ўсё далейшае жыццё чалавека. Такім чынам, на працягу ўсяго перыяд усамавызначэння падрастаючы чалавек знаходзіцца ў поле зроку адукацыйнай арганізацыі. Вялікай заслугай школы будзе тое, калі наш выпускнік ніколі не задасць сабе пытанне: ці правільную прафесію я выбраў?

**Спіс літаратуры**

1. Бобровник, Л. И. Педагогическая диагностика и ее роль в управлении качеством образовательной системы региона / Л. И. Бобровник, Н. М. Кранцевич, А. А. Шнипко // Вышэйшая школа. – 2013. – № 1. – С. 46–50.
2. Жук, А. И. Теоретико-методологические и организационно управленческие проблемы инновационных процессов в современной школе / А. И. Жук // Кіраванне ў адукацыі. – 2000. – № 1. – С. 14–34.
3. Пряжников, Н.С. Профориентация в школе и колледже: игры, упражнения, опросники/ Н.С. Пряжников. – М.: «Вако», 2008. – 288 с.
4. Тихонов, Л. Н. Управление современным образованием: социальные и экономические аспекты / Л. Н. Тихонов. – М.: Вита-Пресс, 1998. – 256 с.
5. Формирование предпринимательских компетенций и навыков деловой активности обучающихся как основы профессионального выбора / сост. : Г. Ф. Бедулина, Л. А. Кивлюк. – Минск: РИВШ, 2017. – 258 с.
6. Чистякова, С.Н. Технология профессионального успеха / С.Н. Чистякова. – М.: «Просвещение»,2003. – 167 с.